БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
[С]эрпухоуская вул. д. № 12

[Р]эдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. [н]асьля поудня.
[А]дміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

[Р]эдакцыя пакідае за сабой права па-[п]раўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш петыту на 1-й стран. 1 руб., на апошнай —50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 58. Менск. Аўторак 4 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 4/6.

Польскае войско надняло [...]ой пачатак у бывших легі[...]ах бышай царскай расій[...]ай арміі.

Царскі урад паогул німчы[...] у сваей палітыцэ рабіу і [...]така падвойную ігру. Даз[в]еннем палякоm уотупаць у [...]е легіоны ен заахвочвау іх [...] вайны на карысьць і з бо[...] Расіі, а усякімі аграпічэн[...]мі ставіу перашкоды легіо[...]м зрабіцца праудзівым вой[ск]ам.

Урад Керэнскаго зьмяніу [...]ую ситуацыю і усімі сіла[мі] працівячыся стварэнню на[цы]янальна - тэррыторыяльных [в]ойск другіх народау, адчыніу [п]рад палякамі шырокую маг[чы]масьць арганізацыі польска[га] войска.

Сярод расійскіх войск раз[в]аея шырока прапаганда. [...]е, хто толькі разумеу поль[ск]ую гутарку, знача палякі і [жых]ыльцы «kresow» заклікалі [...] у польскае войско.

Часьці яго формараваліся за [л]іяй бою, у глыбокім тылу і [д]ля гэтаго ахвотнікау знай[шл]ося шмат, бо салдатам р[ас]скай арміі усім хацелася [д]ей ад фронту.

Аднак кароткі нават час [б]ыту у гэтых легіонах зму[сі]у папаушых у іх ні паля[к]-салдат уцекаць з іх і ісь-[с]працца назад у расійскія [ча]сьці. Да таго моцны пана[...]у у іх дух панскай па[...]ды і вялікапольскай выж[ша]сьці «крулевякау» над «крэ[су]самі».

Большэвіцкія надзеі прыдалі [т]ак гэтаму войску часовую [...]ітасьць духа. Усе што бы[лі] працiунікамі большэвіцкаго [л]аду ухіляючыся ад яго, [...]учы ні хочучы на час за[ні]маліся у легіонах.

Але «тылавое войско» магмець толькі-ж такое зна[чэ]ние. Калі дайшло да бітвы [з] большэвікамі і Довбор-Мусь[ніц]кі заявіу вайну ім, то усе палякі, а разам з імі і [...]ат палякоу пачалі разбе[га]цца з войска. Беларусы па[е]халі дамоу, бо ім ні было [ча]су біцца за польскую ідэю, [за] Варшаускую ойчызну, а літоуцы і палякі лічылі што лепей перапісацца у бежанцы, чым біцца за пекную форму панскіх сынкоу, бывших ахвіцэрамі гэтаго войска. Былі прыпадкі калі аддзелы у некольки сот чалавек растапляліся як сьнег у працягу некольки дзен.

Былі аднак у гэтым войску і праудзіва-польскія элементы, праціпаныя, што датыча салдат прынамсі, поруч с самым цемным расійскім большэвізмам вялікапольскімі дзержаунымі тэндэнцыямі—што есьць вынікам асобнай сыстэмы выхавання народу у самой Польшчы.

Гледзючы на наш край і на Украіну як на часткі Польшчы, яны лічылі патрэбным якімі-б ні было способамі утрымацца тут як сіла каб зауседы быць гатовымі «дапамагчы айчызьне на красах».

З такіх-от элементау і выкаваліся у часе вайны з большэвікамі тыя корпусы якія потым с прыходам да нас нямецкаго войска зрабіліся окупатарамі частак Меншчыны і Магілеушчыны і на Украіне.

Беларусам арганізацыя польскаго войска на тэрыторыі Беларусі зауседы здавалася нібезпэчнай для яе волі.

Цэнтральныя Беларускія Установы ні раз зьверталіся і да ураду Керэнскаго і да большэвікоу с прозьбай назбавіць Беларусь ад гэтаго прывіду польскаго імпэрыялізму, але дзіуным способам у той час як на усіх другіх расійскія урады глядзелі ні даверанучы ім, палякоу яны ні чапалі,—да часу прауда, да прыказау Крыленкі, пасьля каторых Довбор-Мусьніцкі аб'явіу вайну.

Цяпер умоваю нямецкай глаунай каманды с поунамоцнікам 1 польскаго корпусу корпус гэты распушчаецца. Вееткі з Украіны гаворуць што і там зроблено тое-ж самае.

Беларусь можа уздыхнуць вальней: дзякаваць Богу прывід шчэз.

Беларускі селянін апрача таго можа узнясьці у неба і асобную падзяку: за пазбауленне яго ад гнэнбіцеляу, якім былі чыны польскіх легіонау у межах польскай окупацыі Меншчыны і Магілеушчыны.

Кій каторы мейсцамі селяне памагалі хіліць большэвікам на адзін бок, рантам аброс галлем і перахіліушыся на другі бок пачау больна пападаць па усей селянскай массе. Патрыотычна на вялікапольскі лад настроеныя легіоны пачалі сеч цяпер другую старану замест,—той каторая раней цярпела ад большэвікоу. Дапушчалося шмат нісправядліваго, ад чаго награвалася атмосфэра, а цярпеу селянін. Прыходзіушыя адусюль весткі казалі аб такіх грубых паступках з боку легіонау і асобных легіонэрау, што нават каталікі селяне, каторым векамі убівалі у мазгі польскі цьвік, зракаліся свацй аблуды і малілі Бога аб пазбауленню іх ад «брацкаго войска.»

Варшаускі урад можа парадавацца рэзультатам патрыотычнай місіі яго войска—каталікі беларускія селяне навекі пазбавіліся ад польскай орыентацыі.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН 31 мая. «Voss. Ztg.» паведамляе, што нямецкі імпэрскі урад прызнаў слушнасьць за прапазыцыяй расэублікі саветаў зрабіць параду на новай конфэрэнцыі аб аканчацельным высьненні усіх пунктаў мірнаго трактату і прыняў яе, але запрапанаваў, каб конфэрэнцыя сабралася у Бэрліне пад маршалкоўствам фон-Кюльмана.

ЖЭНЭВА 1 гм. «Вольф». Пэтэн, каторы угадываў, што немцы зробяць націск у ваколіцах Элет і Уазы, хаця нічога ні мог зрабіць проціў гэтаго, ёсьць чуткі, атрымае, без ушчэрбу для камандуючаго становішча Фоша, поўную свабоду чыннасьці у часе чаканай спатычкі на Марне.

БЭРЛІН 1 гм. «Вольф». Учора Клемансо прымаў соцыялістычную дэлегацыю з якой меў парады аб рожных пытаннях датычучых ваеннай сытуацыі.

Клемансо сказаў, што ні згаджаецца на разгляд запытання Кошэна і Брюнэта, аб ваенных апэрацыях і ў аўторак зробіць у Палаце дэпутатаў адпаведнае паведамленне.

БЭРН 31 мая «Вольф». Дэпутат Брюнэт учора прачытаў у Палаце дэпутатаў інтэрпэлляцыю аб адказе за бітву пад Эн. Дэпутат Кошэн запрапанаваў зрабіць дыскусію над агульным становішчом.

БЭРЛІН 1 гм. «Вольф». Гішпанскі пасол у Бэрліне атрымаў падробнае тэлеграфнае паведамленне аб эпідэмыі у Гішпаніі.

Эпідэмыя мае прычынай катар, які наступае разам з раптоўнай гарачкай. Гарачка трывае 3-4 дні, пасьля чаго прыходзіць поўнае выздароўленне. Хвароба ні злучэна ні з якімі нібезпечэнствамі. Дагэтуль ні было ні воднаго выпадку сьмерці. Лічба занедужаўшых паданая Рэйтэрам павялічана.

БЭРЛІН. Начальнік 50-ай англіцкай дывізіі, гэнэрал Рээс, узят у начы с панядзелку на аўторак у палон.

Аб пасьпешнасьці, з якой былі кінуты ў бітву француская дывізіі, можна судзіць паводлуг таго, што адна з іх два дні аставалася без яды. Увесь 11-ты францускі корпус папаў у палон.

Шмат дзе французы аказвалі вельмі цьвёрды адпор. На вяршыне Барбаросса адзін францускі маёр сам адзін бараніўся далей, -кідаючы ручныя гранаты. Толькі с трудом удалося ўзяць у палон адважнаго афіцэра.

БЭРЛІН. Дабыча паленнымі артылерыей і ваеннымі матэрыяламі на атакованым фронці безупынна узрастае. Узяты некольки нагружэных поездаў. Жыхары ў панічным страху ўцекаюць у глыб краю. Нячысьленыя астаўшыеся жыхары страшэнне абураны на англічан і вінаваціць іх у ніўдачы.

Астаткі Форт-Мальмэзон пануюць над усей ваколіцай. Склоны гары гэткія абрывістыя што можна думаць, быццым некалькі душ маглі-бы камоньмі скінуць штурмуючых ворагаў.

БЭРЛІН 30V. **Урадова.** С прычыны апошняй пабеды нямецкіх войск пад камандай нямецкаго насьледніка Імпэратар даў сваймy сыну вялікі крыж са зьвяздою ордэну Гогенцолернаў.

ШТОКГОЛЬМ. 30V. Шведзкае тэлеграфнае агенцтво ўрадова апавешчае:

Наш пасол у Лёндоне паказывае тэлеграмай, што Швецыя і саюзнікі падпісалі сягоння ўмову аб аддачы саюзнікам швэдзкіх караблёў.

ВЕНА. Прэзыдзіум украінскаго клюбу, зложэны с Петрусэвіча і Левіцкаго, апавешчае заяву аб дадзенай яму аўдыэнцыі Кюльманам. 24 мая прэзыдзіум быў у статс-сэкрэтара, каб высказаць яму ніспакойства ўкраінскаго насялення с прычыны чутак, быццым берасьцейская ўмова, якой зацікаўлены і аўстрыяцкія ўкраінцы, будзе нарушэна. Статс-сэкрэтар Кюльман, сказаў што Нямеччына будзе і далей цьвёрда стаяць на грунці берасьцейскае ўмовы. Страх, быццам дзержаўная ніжалежнасьць Украіны апынулася ў небаспечнасьці, абсолютна ні на чым ні аснован.

РОТТЭРДАМ. «Manchester Gwardian» піша:

Цыфры затопленных караблёў ні даюць цяпер яснаго выражэння размерарў падводнае вайны. Брытанскія вэрфі запоўнены караблямі, каторыя, праўда, ні затанулі, але вельмі папсованы варожымі падводнымі лодкамі. У кожным порце Брыстольскаго каналу пануе нізвычайна жывая работа. Чысло загадаў аб направцы караблёў—вялізарнае, і ўсе яны ні могуць быць споўнены. Усе вэрфі маюць доўгі спіс гэтакіх заказаў, выпаўненне каторых займець найбліжэйшыя месяцы. Ясна, што гэныя папраўкі могуць быць зроблены толькі са шкодай для новай будоўлі. За

першыя чатыры месяцы сёлётняго году у Англіі набудавалі 431.800 тонн. Калі имбкасць работ астанецца нізьменнай, дык за 1918 год замест спадзеваных 2—3 мільёнаў тонн будзе збудовано толькі 1,3 м. т.,—значыць, гэтулькі, сколькі нямецкія падводныя лодкі топяць сярэднім лікам за 2 месяцы.

БЭРЛІН 30/V. Урадова. Нашы падводныя лодкі ізноў затапілі ў паўночных водах 9500 тонн.

МАСКВА 24 мая. Урад Каўказу праз пасрэдніцтво графа Мірбаха запрапанаваў савецкаму ураду пачаць падгатоўчыя перагаворы аб умове што датыча стасункаў паміж Расіяй і Каўказскай рэспублікай. Чычэрын гэтую прапазыцыю прыняў.

КІЕУ 30 мая. Назначэны украінскім пасланікам у Бэрліи барон Штэйнгалль, пасьля назначэння выйшоў с кадэтскай партыі.

Весткі с Польшчы.

ВАРШАВА. Ад 28 маю начала выходзіць газэта выдаваная рэдакцыямі газэт: «Gazeta Poranna» «Głos» «Godzina Polski», «Goniec Warszawski», «Kurjer Polski», «Kurjer Warszawski», «Nowa Gazeta», «Polak-Katolik» і «Przegląd Poranny i Wieszorny».

Газэта называецца «Dziennik Wspulny» — Супольная газэта. Выхад яе выкліканы друкарскім штрэйкам. Места работнікаў на час штрэйку заступяць хадзяі друкарняў.

— Як паведамляе «Dz. Wsp.» у Варшаву 29 мая прыбыў поўнамоцнік папы рымскаго Я. Э. кс. др. Ахіллес Ратті.

Я. Э. кс. візытатор 30 мая у $9^1/_2$ гадз. адбыў урочысты выхад у катэдру і учасьнічыў у сумме і процэсіі.

31 мая у $7^1/_2$ гадз. вечара Я. Э. прыймаў у сябе сьвецкае і чорнае духавенство.

Кс. А. Ратті мае астацца у Варшаве на сталае жыццё.

— 13, 15 і 16 чэрвеня у Варшаве адбудзецца з'езд прэдстаўнікаў добрачынных і ратунковых інстытуцыяў Каралеўства, склікаиы «Глаўнай Апекунскай Радай», якая разаслала ужо 5000 позваў. З'езд мае стварыць агульны краёвы цэнтр і статыстычнае бюро, і заняцца справай знайходжэння новых грашовых крыніц для працы усіх арганізацыяў.

Паведамляюць с Кракова што тамака памер архіепіскап каталіцкі Сімон, даўней быўшы суфраганам Магілеўскай эпархіі.

На беларускім шляху.

— **У Вільні** 26 і 27 мая адбываліся пленарныя заседанні Беларускай Рады. З'ехаліся усе члены Рады с правінцыі. Разгледаліся вельмі важныя справы беларускага жыцця і прыняты адпаведныя рэзалюцыі.

У нарадах прынімалі учасьце дэлегаты Горадненскаго Губэрнскаго Цэнтральнаго Камітэту злучэных грамадзкіх арганізацый у Пецярбурзі: старшыня Бахановіч і сэкрэтар Мінько. Камітэт гэты мае свае паунамоччы ад 451.000 арганізаваных уцекачоу з Горадненшчыны. Дэлегаты, апіраючыся на рэзалюцыях з'ездау уцекачоу, высказалі сваю згоднасьць с палітычным становішчым Рады.

Радзе даручэн горадненскай дэлегацыей палітычны мандат ад імі 451.000 арганізованых уцекачоу. Са свайго боку Рада прасіла Горадненскі Камітэт занімацца варочаннем да хаты разам з горадненскімі такжэ і беларускіх уцекачоу з Віленшчыны, Меншчыны і Ковеншчыны.

— **У Пецярбурзі** арганізуецца „Рада беларускіх арганізацый окупованных зямель". Мэта—яе абарона нацыянальных інтарэсау беларускаго насялення зямель, адрэзаных ад рэшты Беларусі на моцы Берасьцейскае умовы.

Паводлуг думкі нікаторых грамадзкіх арганізацый, праектуецца утварэнне Рады злучэных грамадзкіх арганізацый дзеля варочэння дамоу уцекачоу з Літвы і окупаваных часьцей Беларусі.

Камісар пецярбурскаго аддзелу беларускаго камісарыяту, Лагун, апавешчае беларускіх уцекачоу, што уцекачом-беларусам ні маюць права выдаваць пашпартоу ані польскія, ані мусульманскія арганізацыі, а такжэ падае да агульнаго ведама, што пытанне аб уцекачох дагэтуль ні разьвязано, што уселякі ніарганіваны рух у бацькаушчыну зьвязан з вялізарнымі труднасьцямі, дый зусім ні можэ быць дапушчэны, бо уносіць разлад у справу варочання уцекачоу.

„Гоман"

Беларускі тэатр

«КАЛІСЬ...»

У суботу 1- чэрвеня Першым Таварыствам Беларускай Драмы і Камэдыі ў Народным доме, імяні Максіма Богдановіча пастаўлена была драма Олехновіча ў 2 актах «Калісь», зрабіўшая на публіку нізвычайна моцнае ўражэнне. Пасьля спаду заслоны ўсе ішчэ выклікалі артыстаў. Драма куртаценькая, сьціснутая ў 2 акты. Сюжэт яе—рэвалюцыя 1905—1906 г. г. У кватэры беднаі прачкі йграецца уся сцэна. Дачка прачкі Людвіка, закаханая у кватэранта іх Юрку Івашку, захапляецца магутным рухам рэвалюцыі і паміж Людзьвісяй і яе Маткаю ідзе вялікі нілад, бо старая прачка с сваімі заматарэлымі поглядамі ні можа паднядца да разуменняў маладой дзяўчыны. Юрка выежджае для рэвалюцыйнай працы на вёску. У горадзі тым часам пачынаюцца мітынгі і забастоўкі, аб чым вядуць сабе гутарку прачка с суседкаю, дзівючыся таму, што вакол іх дзеецца. Зьяўляецца на гутарку іх Людвіка, ўся абвеяная народным паўстаннем. Пасьля ніпрыемнай размовы з маткаю яна атрымвае ліст [праз хлопчыка—«таварыша»] ад Юркі Івашкі, за што маці іншчэ горш нападае на яе, але раздаецца на вуліцы гімн «Кроў нашу льюць даўно ўжо каты...» і Людвіка рвецца туды ў паўстаўшы натоўп: Маці затрымвае яе. Чутно свісткі паліцыі, стральніну, гімн, крыкі «ура». У кватэру ўносяць раненаго Івашку; Людвіка спэрша ні пазнае яго, а потым, агледзіўшы ў яго рану бяжыць ў аптэку. Маці устрывожана гэткай нітрыемнасьцю як падстрэляны рэвалюцыянэр ў яе хаці, той самы яе кватэрант, праз катораго ў яе хаці быў обыск. Пакуль яна вышла ў кухню каб даць хвораму вады, ён ужо намірае, ўпаўшы сярод хаты. Людвіка вертаецца каб выліць над трупам каханка пламя сваей помсты за гэроічную сьмерць Юркі. З вуліцы чуваць гімн... Яна бярэ с кішэня Юркі браунінг, вылетае на вуліцу. Маці хоча спыніць яе, але ўжо позна... Чутно стрэл... адзін... другі... трэці ..

Агністую ролю Людвікі выканала наша таланавітая камэдыянтка Паўліна Мядзіолка с такой здатнасьцю, с такой натуральнасьцю, што адразу пераносіла нас ў мінулую нідаунюю эпоху спробы народных сілаў. Уся фігўра артысткі гарэла энтузіязмам, ніўстрыманаю смагаю помсты. У апошнім акце энтузіязм яе даходзіць да найвыжшаго напружэння—яна як бура вылетае на сустрэч гімну для актыўнай барацьбы, на вуліцы грымяць яе стрэлы.

‚Нізгорш ўдалася Маці нашай вядомай артыстцэ В. Тарасік. Суседка (Л. Зорка) папала ў сваю ролю. У ролях простых кабетаў Зорку замяніць німа кім. Яна з асабістым спрытам малюе тыпы нашых беларускіх кабетаў. На гэты раз яе простая гутарка с прачкаю сьведчыць аб безумоўным таленцэ. Іваноў ў ролі Юркі быў вельмі пекным. Пятровіч добра веў кароценькую ролю акалодачнаго. Л. Зарніца выступала ў такой жа кароценькай ролі хлопчыка.

У нядзелю 2 чэрвеня ў пяты раз пастаўлены быў ангельскі фарс «Цётка вінавата», апрацованы і пераложаны рэжыссэрам «Драмы і Камэдыі» Ф. Ждановічам, які ў ролі хвальшывай цёткі праз ўвесь вечар выклікаў публіку на гомэрычны сьмех. Яму добра дапамагаў Пятровіч ў ролі Спэцінга.

Знаемы.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 2 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта. На шмат мейсцаў фронту артылерыйскія бае. Ангельскія атакі паўднёвей р. Ліс паўночней Альбэра пацярпелі нітўдачу пры велькіх стратах.

Група арміяу Нямецкаго Кронпрынца. Поўднева-ўсходней Нуайона мы націснулі ніпрыяцеля, ні гледзючы на моцнае праціўленне да лесу Карлепонь і Монтан. Мы ўзялі ўзвышша ўсходней Мулэн-су-Туван і ніпрыяцельскія пазыцыі захадней Нуврона, моцна зацягнутыя дротам.

Атакаю на абодвых бакох р. Урсі адкінулі мы ніпрыяцеля за вучастак Савьера і заўладалі ўзвышшамі Пассі Куршан.

На Марні палажэнне без перамен. Частка замку Тьеры, што на паўночным беразі рэкі была аиратана ніпрыяцелем.

Паўночна-ўсходней Вэрнэй і на абодвых бакох Арды былі адбіты моцныя контр-атакі французаў з вялікімі для ніпрыяцелямі стратамі. Усходней Раймсу ўварваліся мы французкія акопы каля Сэнт-Леонор і ўзялі ў палон гарнізон форту Помпель занятаго намі па дарозі.

Французка-амэрыканскія склады вялікіх размераў каля Фер-ан-Тардэнуа папаліся ў нашыя рукі. Больш як поў мільёна снарадоў, нізлічаныя запасы сапернаго і тэлефоннаго мення, больш як 1000 самаходаў былі ўзяты тутака.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

На боновыя кніжкі заутра, 5 чэрвеня, будзе выдано на душу 2 ф. цукравого пяску па 1 р. 20 к. за фунт, $^1/_2$ ф. солі за 10 к., $^1/_2$ ф. сушэнай агародніны за 35 к. і 1 пудэлка запалак за 12 кап.

У першым пазычкова-зьберагацельным Т-ве да гэтаго часу, ні гледзючы на усе „прыгатоуленні", яшчэ ні адбыуся годавы сход членау дзеля разгляду і пацьвярджэння падрахунку за мінуушы год, сьметы на бягучы і выбранне асоб на пасады. Апошняе пытанне,—выбранне асоб на пасады,—толькі і затрымлівае усе і усіх у закаудованным крузе: трэба ж выбраць як найболей пасуючы элемэнт, каб правесьці «сваіх» людзей на платныя мейсцы амэрыканскім способам.

Каталіцкая працэсія, Божэ Цело, адбылася у нядзелю, 2 чэрвеня, пры самай таржэсьцьвенай абстаноуцы, хаця па эмблеме «арла» на харугвах выходзіць, што працэсія была болей элегантна-*палітычная* але ніяк ні рэлігійная.

Гэта ужо зусім ні к мейсцу! Прауда, усе цяпер захоплены палітыкай, але што датыча Бога у палякоу, то Ен толькі і займаецца іх нацыяльна-палітычнай працай, другой работы яны яму цяпер ні даюць...

У сталоуцы пры ст. Менск Л. Р. ж. д. за дэмократычныя абеды з 2 страу (без хлеба) апошнімі часамі бяруць 1 р. 50 к.

У афіцэрскім бюро, згодна вывешанай абвестцы, ад 1 чэрвеня расцэнка штодзеннаго пайка павялічэна с 1 м. 30 ф. да 2 марак, с прычын дарагавізны.

Пэнсіянэрам ні будуць выдаваць пэнсіі у чэрвені, с прычын вялікаго дэфіцыта у абаротных грошах губ. казначэйства: ні хапае—60,000 р. нават на выплату пэнсіі казенным установам.

Пэнсыянэры, ні атрымліваючы пэнсіі ужо некалькі месяцау, перажываюць вельмі крытычнае становішчо.

Памешшэнне безрабоціцы, у росшай у Менску, ні гледзюч на усе старанні бюро для бе работнай біржы працы і інш да упошніх мэтау, мае быц праведзено новым месьскім г лавою Хржонстоускім у бл жайшы час способам належ чай арганізацыі агуловых гр мадзкіх работ.

Хадатайство аб отпуску ня мецкімі уласьцямі субсідыі н уладжэнне трамвая (прарванаг у 1915 г. дзеля ваенных ва рункау), забрукаванне вуліц будаванне новай воданопорна башні, па ініцыятыве новаг меськаго галавы Хржонстоу скаго, узбуджаецца нашы самаупрауленнем у самым ка роткім часе.

Месячны отпуск члена губ земуправы Злобіна, як нас па ведамілі, адбыуся адразу за выбраннем земствам рэвізый най камісіі, у чале с вып. па саду старшыні акружного супа Шындлерам, дзеля праверкі дзеяльнасьці установау У. З. С. К. З. Ф. перайшоушых да менскаго губ. земства.

Такса у менскіх лазьнях (дваранскі аддзел), за апошні месяц падняушаяся да $1^1/_2$ руб. за душу, мае тэндэнцыю к новаму павышэнню.

Мільенная нідаімка ад насялення губэрні, належачая губ. земству у відзе земско-раскладачнаго паземельнаго і др. зборау, запушчэная за час вайны, ні гледзя на уселякія меры і старанні, ні уплачываецца.

І земство, як і месьская управа, церпіць крайні грошавы нідахват, жывучы як—кольвек грашыма страхавога капіталу, і без таго нізавіднымі.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтве **Т-ва «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.